**ТАЛАКА**, шануемая на ўсёй Беларусі апякунка жніва і ўрадлівасці. У яе гонар ладзілася ўрачыстае радаснае свята ў час уборкі ўраджаю. На Дажынках удзельнікі жніва кідалі жэрабя, каму быць Т. Абранніцу ўпрыгожвалі рознымі кветкамі, у рукі давалі дажынкавы сноп, на галаву надзявалі вянок з доўгім белым пакрывалам накшталт шаля, і карагод акружаў Т. і скакаў, прыпяваючы, пасля чаго, пастаўшы за Т. папарна, ішлі ў дом гаспадара. Той падносіў Т. хлеб-соль, кланяўся ў пояс, а яна ўзамен аддавала гаспадару сноп. Т. бралі пад рукі і саджалі на кут. Пасля заканчэння вячэры карагод з Т. дзякаваў гаспадарам за пачастунак пацалункамі. Т. аддавала свой вянок гаспадару, а пакрывала пакідала сабе на памяць. Талачэйкі абавязаны былі правесці Т. да самага яе дома.

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1846. Прибавления. Кн. 4.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ